УДК 373.31

# КАГНІТЫЎНАЯ ВІЗУАЛІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАЙ ІНФАРМАЦЫІ Ў І КЛАСЕ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛ З РУСКАЙ МОВАЙ ВЫХАВАННЯ І НАВУЧАННЯ

**Н. У. Мурашка**
*ДУА «Сярэдняя школа № 196 г. Мінска», г. Мінск, Беларусь,*
*e-mail: m6556598@yandex.ru;*

**А. С. Шылава**
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»,*
*г. Мінск, Беларусь, e-mail: nigr@tut.by*

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў.

*Ключавыя словы:* маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, кагнітыўная візуалізацыя, ілюстраванне вучэбнага матэрыялу.

Адной з актуальных праблем на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Працэс яе фарміравання на ўроках беларускай мовы ў І класе з'яўляецца крапатлівым і патрабуе пэўных намаганняў. У такім выпадку неабходна шукаць новыя падыходы правядзення ўрокаў, калі ствараюцца ўмовы для яе фарміравання ў навучэнцаў з рознымі ўзроўнямі матывацыі.

У апошні час у навукова-педагагічным асяроддзі ўсё часцей можна пачуць тэрмін «візуалізацыя» або «кагнітыўная візуалізацыя». Так, напрыклад, у дадатку 1 да Інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў 2021/2022 навучальным годзе» для метадычнай работы з настаўнікамі пачатковых класаў прапануецца агульная метадычная тэма «Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў пачатковых класаў па выкарыстанні тэхналогій візуалізацыі вучэбнай інфармацыі ў сучасным адукацыйным працэсе» [1, с. 15].

Аднак перад пачаткам выкарыстання тэхналогій візуалізацыі вучэбнай інфармацыі неабходна разуменне дэфініцыі такіх паняццяў, як «візуалізацыя», «кагнітыўная візуалізацыя» і «нагляднасць».

Т. А. Сырына, пры ўдакладненні гэтых дэфініцый, прыходзіць да высновы аб сінанімічнасці паняццяў «візуалізацыя» і «нагляднасць», якія абазначаюць «…спосабы больш адвочна прадставіць навучальны матэрыял…» [2, с. 81], у той час як «кагнітыўная візуалізацыя» валодае «...перавагай, з'яўляючыся не толькі ілюстрацыяй, але і спосабам пазнання і развіцця мыслення, не столькі сродкам навучання, колькі яго прадуктам» [2, с. 83].

Курс беларускай мовы ў I класе агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання і выхавання з'яўляецца вусным, дамінуючымі задачамі якога разам з іншымі выступаюць: фарміраванне ўменняў асэнсаванага ўспрымання беларускага маўлення на слых і практычнае авалоданне лексічным багаццем мовы [3].

Знаёмства з новымі словамі ў I класе адбываецца, згодна з праграмай, па схеме, калі «…некалькі лексічных груп, кожнай з якіх прысвечаны асобны ўрок, аб'ядноўваюцца ў больш буйную групу тэматычнай лексікі» [4, с. 6] і, згодна з метадычнымі парадамі, з апорай на ілюстраванне вучэбнага матэрыялу, якое дапаўняе вуснае тлумачэнне і ажыццяўляецца непасрэдна падчас урока.

Навучэнцы I класа знаёмяцца з новымі словамі беларускай лексікі на кожным ўроку пры сустрэчы з імі ў вучэбных тэкстах. Тлумачэнне лексічнага значэння слова не запяспечвае трывалага папаўнення слоўнікавага запасу, і, як след, не спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, таму неабходна мэтанакіраваная і сістэматычная работа, якая магла б гарантаваць загадзя спраектаваны вынік. Вось як раз на гэтым этапе кагнітыўная візуалізацыя вучэбнага матэрыялу дапаможа настаўніку пачатковых класаў атрымаць жадаемы вынік, так як візуальнае суправаджэнне інфармацыі значна павышае ўзровень яе засваення.

Адным са сродкаў кагнітыўнай візуалізацыі вучэбнай інфармацыі для навучэнцаў I класаў, з улікам узроставых асаблівасцяў навучэнцаў, з'яўляецца размалёўка.

Размалёўка – гэта не проста чорна-белы малюнак на паперы, а яшчэ і выдатны сродак навучання і ілюстравання вучэбнага матэрыялу. Выкарыстанне размалёвак у адукацыйным працэсе для навучання дзяцей малодшага школьнага ўзросту дапамагае нам:

– атрымліваць вучнёўскі прадукт ілюстравання навучальнага матэрыялу;

– візуалізаваць навучальны матэрыял, што дазваляе ствараць устойлівы вобраз моўнай адзінкі;

– фарміраваць навык канцэнтрацыі ўвагі, які па прычыне ўзроставых асаблівасцей дзяцей малодшага школьнага ўзросту яшчэ недастаткова сфарміраваны;

– развіваць маторыку рук навучэнцаў;

– развіваць творчае мысленне і творчыя здольнасці ў навучэнцаў.

Пад час работы з размалёўкай важнае значэнне мае і подпіс саміх выяў прадметаў. Паколькі пісаць на беларускай мове навучэнцы I класа яшчэ не могуць, а навык чытання паступова пераносіцца з рускай мовы, то мэтазгодна ў якасці подпісу да малюнка пакідаць контур літар (рысунак 1), які вучні таксама могуць размалёўваць. Гэта абумоўлена тым, што, пакуль размалёўваюцца літары, вучні некалькі разоў чытаюць самі словы ці толькі знаёмыя літары і запамінаюць іх.




*Рысунак 1. – Прыклад размалёвак розных тэматычных груп*

Такім чынам, можна сцвярджаць, што размалёўка з'яўляецца не толькі сродкам ілюстравання вучэбнага матэрыялу, але і сродкам пазнання лексічных адзінак беларускай мовы і прадуктам іх вывучэння.

Разгледзім некаторыя метады і прыёмы выкарыстання размалёвак ў адукацыйным працэсе пры вывучэнні прадмета «Беларуская мова» ў I класе агульнаадукацыйных школ з рускай мовай выхавання і навучання.

*Стварэнне тэматычнага асяроддзя.* Просты наглядны спосаб назапашвання і выкарыстання на практыцы слоў. Яго можна ажыццяўляць і з дапамогай дзіцячых размалёвак, якія настаўнік падчас вывучэння новых слоў з выявамі патрэбных прадметаў раздае вучням. Навучэнцы іх самі размалююць, а затым развешваюць у класе на ўзроўні вачэй.

*Тэматычныя ілюстрацыйныя слоўнікі* [5]. З дапамогай размалёвак можна ствараць тэматычныя ілюстрацыйныя слоўнікі. Яны вельмі зручныя, бо лёгкія ў стварэнні і прымяненні і заўсёды знаходзяцца пад рукамі. Акрамя таго, гэта яшчэ і цікавы творчы працэс, у якім задзейнічаны ўсе навучэнцы.

*Стварэнне калажэй па заданай тэме* [5]. Гэта яшчэ адзін цікавы варыянт вывучэння і замацавання слоў з дапамогай дзіцячых размалёвак.

Настаўнік дзеліць клас на некалькі груп Кожнай группе прапаноўваецца тэма калажа і размалёўкі з неабходнымі выявамі прадметаў. Удзельнікі групы расфарбоўваюць па адным прадмеце і подпісу да яго. Выява прадмета і подпіс выразаюцца нажніцамі паасобку. Пасля таго як кожны вучань скончыў сваю частку працы, група абмяркоўвае кампазіцыю і стварае калаж. На апошнім этапе навучэнцы размяшчаюць подпіс да кожнага малюнка.

Такім чынам, выкарыстанне размалёвак на ўроках беларускай мовы ў I класе можна разглядаць як адну з тэхналогій кагнітыўнай візуалізацыі вучэбнага матэрыялу, накіраваную на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў малодшага школьнага ўзросту.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Особенности организации образовательного процесса на 1 ступени общего среднего образования в 2021/2022 учебном году : инструктивно-методическое письмо Министерства образования Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. образовательный портал Нац. ин-та образования. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2021-2022-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2021-2022/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021/3799-ii-klass.html. – Дата доступа: 21.08.2021.
2. Сырина, Т. А. Когнетивная визуализация: сущность понятия и его роль в обучении языку / Т. А. Сырина // Вестник Томского гос. пед. ун-та. – 2016. – № 7. – С. 81–84.
3. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання [Электронны рэсурс] / Нац. адукацыйны партал Нац. ін-та адукацыі. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2021-2022-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2021-2022/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021/3797-i-klass.html. – Дата доступу: 14.07.2021.
4. Антонава, Н. У. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 1 клас / Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. – 4-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2020. – 138 с.
5. Niebuhr-Siebert, S. Kinder mit Deutsch als Zweitsprache in der Grundschule / S. Niebuhr-Siebert, H. Baake. – Stuttgart : W. Kohlhammer GmbH, 2014. – 326 s.

УДК 373.31

# К ВОПРОСУ ОБ ИСПОЛЬЗОВАНИИ МЕТОДА МОДЕЛИРОВАНИЯ В НАЧАЛЬНОЙ ШКОЛЕ

**Ю. А. Нахшон**

*ГУО «Средняя школа № 42 г. Минска», г. Минск, Беларусь,*
*e-mail: poxoyaia@mail.ru*

В статье рассматривается метод моделирования как лучший способ при решении текстовых задач на этапе формирования умения решать простые задачи в начальной школе, что повышает интерес учащихся к математике и позволяет реализовать воспитательную функцию обучения. Проводится анализ результатов использования данного метода в начальных классах.

*Ключевые слова:* метод моделирования, решение текстовых задач, начальная школа, предметное моделирование, учебный процесс.

Особенностью современной системы образования является поиск новых путей развития и модернизации. Особую важность приобретает развитие личности ребенка, раскрытие его внутреннего потенциала. Поэтому взаимодействие различных педагогических систем и внедрение инновационных образовательных технологий актуально не только в средней, но и в начальной школе.